№15 (300)
2011

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Еўразьвяз заклікаў Беларусь ня ўводзіць шэраг новых законапраектаў

"З вялікім непакоем мы прымаем да ведама зацьверджаны ў беларускім парламенце праект паправак да закону аб грамадзкіх арганізацыях, нацэлены на міжнародную падтрымку беларускай грамадзянскай супольнасьці і палітычнай апазіцыі", – заявіла Мая Качыянчыч, прэс-сакратар вярхоўнага прадстаўніка ЕЗ па замежных справах і палітыцы бясьпекі Кэтрын Эштан.

Яна адзначыла, што новы законапраект "мае на ўвазе далейшае ўзмацненьне жорсткасьці абмежаваньняў на дзейнасьць у краіне грамадзянскай супольнасьці і палітычнай апазіцыі, якія ўжо дзейнічаюць у складаных умовах і якія зьяўляюцца аб'ектам абмежавальных правілаў рэгістрацыі".

Прэс-сакратар таксама нагадала, што беларускі парламент прыняў папраўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах, якія абмяжоўваюць правы грамадзянаў Беларусі на свабоду выказваньня і сходаў.

"Мы таксама занепакоеныя бягучым разглядам законапраекту аб органах дзяржаўнай бясьпекі, які можа пашырыць рэпрэсіўныя паўнамоцтвы КДБ", – сказала Качыянчыч.

"ЕЗ заклікае Беларусь ня ўводзіць у дзеяньне гэтыя тры законапраекты, улічваючы, што яны сталі б сур'ёзным крокам назад ў сферы правоў чалавека і вяршэнства закону ў Беларусі. Мы працягнем сачыць за сітуацыяй і гатовыя да адпаведных дзеяньняў", – заявіла прэс-сакратар Кэтрын Эштан.

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.by*




Менск, 8 кастрычніка 2011 году.

# Гэта толькі пачатак?..

Нягледзячы на моцны дождж, у Народным сходзе ў Менску 8 кастрычніка ўзялі ўдзел каля тысячы чалавек. На акцыі выступілі Віктар Івашкевіч, Генадзь Фядыніч, былы палітвязень Зьміцер Дрозд. Па закліку Віктара Івашкевіча, удзельнікі Народнага сходу прагаласавалі за шэраг патрабаваньняў, якія вырашана перадаць ва ўрад і адміністрацыю прэзідэнта. Івашкевіч заклікаў удзельнікаў сходу сабрацца на наступны сход 12 лістапада на плошчы Бангалор. Акцыя скончылася затрыманьнем 12 чалавек, 9 з якіх – прадстаўнікі анархісцкага руху. У рэгіёнах акцыі былі нешматлюднымі, а ў некаторых гарадах увогуле не адбыліся.

У Віцебску ў Народным сходзе ўдзельнічала 300 чалавек, у Гомелі – 400, Берасьці – 250, Магілёве – 250, Бабруйску – 200, Жлобіне – 100, Баранавічах – 100, Глыбокім – 80, Оршы – 70, Полацку – 60, Наваполацку – 50, Вялейцы – 50, Слоніме – 30, Слуцку – 20, Кобрыне – 10...




Менск, 8 кастрычніка 2011 году.

# Аб пагрозе абмежаваньня правоў чалавека

## Заява лідараў арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці Беларусі

Мы, прадстаўнікі арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці Беларусі, лічым, што заканадаўчыя акты, якія цяпер разглядаюцца і прымаюцца ў парламенце Рэспублікі Беларусь, маюць відавочна антыправавы характар, скіраваныя на празьмернае абмежаваньне правоў і свабодаў грамадзянаў, перашкаджаюць нармальнаму грамадзкаму дыялогу і распальваюць канфрантацыю ў Беларусі.

1. Праект Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" стаў прадметам абгрунтаванай крытыкі з боку грамадзкасьці, аднак быў прыняты сёлета 3 кастрычніка Палатай прадстаўнікоў адразу ў двух чытаньнях у выглядзе, які парушае права грамадзянаў на мірныя сходы, гарантаванае як Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, так і базавымі нормамі міжнароднага права, уводзіць адміністрацыйную адказнасьць грамадзянаў за бязьвінныя дзеяньні і бязьдзеяньне.

2. Праект Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні дапаўненьняў і зьменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь" быў распрацаваны, унесены ў парламент і прыняты сёлета 3 кастрычніка Палатай прадстаўнікоў адразу ў двух чытаньнях, без публічнага абмеркаваньня. Гэты закон стварае новыя падставы для крымінальнага перасьледу актывістаў грамадзянскай супольнасьці і ўдзельнікаў мірных масавых акцыяў, парушае свабоду выказваньня, свабоду сходаў, свабоду аб'яднаньняў.

3. Трывогу і абурэньне выклікае таксама ўнесены ў парламент праект Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменнаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь", які значна пашырае паўнамоцтвы сьпецслужбаў, робіць іх бескантрольнымі і фактычна ставіць іх па-над законам.

Мы, прадстаўнікі арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці Беларусі, лічым, што гэтыя праекты актаў заканадаўства супярэчаць міжнародным прававым абавязальніцтвам Рэспублікі Беларусь у галіне правоў чалавека, зьяўляюцца неканстытуцыйнымі і палітычна шкоднымі для краіны.

Як стала вядома, ініцыяваньне зьменаў у Законы "Аб палітычных партыях", "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях", у Крымінальны кодэкс і ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэньнях было зьдзейсьненае Саветам міністраў яшчэ ў чэрвені бягучага году. Адсутнасьць грамадзкага абмеркаваньня гэтых надзвычай важных актаў, а таксама іх прыняцьцё непразрыстым і непублічным парадкам ёсьць яшчэ адным сьведчаньнем неправавога характару гэтых паправак, прыняцьце якіх не было выклікана аб'ектыўнымі патрэбамі грамадзкага жыцьця.

Мы таксама лічым, што прыняцьцё гэтых дакументаў скіраванае на запалохваньне беларускай грамадзкасьці, якое ставіць пад пагрозу вяртаньне краіны на шлях нармальнага разьвіцьця і заганяе яе ў стан самаізаляцыі. Прыняцьцё такога рэпрэсіўнага заканадаўства будзе азначаць легалізацыю гвалтоўных метадаў барацьбы з палітычнымі апанентамі, створыць у краіне атмасферу страху, падштурхне грамадзтва да радыкалізму і зробіць немагчымым канструктыўны грамадзкі дыялог. На ініцыятарах прыняцьця гэтых законапраектаў, а таксама на іх распрацоўшчыках, дэпутатах Палаты прадстаўнікоў і чальцах Савету Рэспублікі палягае адказнасьць за такія наступствы неабдуманай заканатворчай дзейнасьці.

На падставе выкладзенага і грунтуючыся на прынцыпах Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, згодна з нормамі артыкулу 59 Канстытуцыі, паводле якога дзяржава абавязаная ўжываць усе даступныя ёй захады для стварэньня ўнутранага парадку, неабходнага для поўнага ажыцьцяўленьня правоў і свабодаў грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, мы, прадстаўнікі арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці Беларусі, настойліва заклікаем:

– Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – адмовіцца ад падпісаньня спрэчных Праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" і Праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні дапаўненьняў і зьменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь", вярнуўшы іх у парламент для дапрацоўкі;

– Палаты парламента – правесьці публічнае абмеркаваньне праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" і праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні дапаўненьняў і зьменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь", не хаваючы ад грамадзкасьці сапраўдных прычынаў, якія пабуджаюць органы выканаўчай і прадстаўнічай улады ўводзіць гэтыя зьмены ў заканадаўства;

– Савет міністраў – адклікаць з парламенту праект Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь";

– Канстытуцыйны суд – скарыстацца правам канстытуцыйнага кантролю дзеля прадухіленьня парушэньня канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзянаў, выкліканых прыняцьцем праекта Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" і праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні дапаўненьняў і зьменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь", а таксама праекту Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь".

*Людміла ГРАЗНОВА, Праваабарончы альянс*
*Алег ГУЛАК, РПГА "Беларускі хельсінскі камітэт"*
*Уладзімір КОЛАС, Рада беларускай інтэлігенцыі*
*Жанна ЛІТВІНА, ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"*
*Марыя МАРТЫСЕВІЧ, РГА "Беларускі ПЭН-цэнтр"*
*Сяргей МАЦКЕВІЧ, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў*
*Вольга СМАЛЯНКА, Цэнтр прававой трансфармацыі*
*Валянцін СТЭФАНОВІЧ, Праваабарончы цэнтр "Вясна"*
*Аляксей ШЭІН, Грамадзкая ініцыятыва "За свабоднае веравызнаньне"*
*Аляксандр ЯРАШУК, Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў*
*Алена ТАНКАЧОВА, Цэнтр прававой трансфармацыі*

# Вызваліць неадкладна...

## Лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі міру Шырын Эбадзі і Аун Сан Су Чжы выступілі ў падтрымку Алеся Бяляцкага

"Сітуацыя праваабаронцаў па ўсім сьвеце застаецца крытычнай. Прыкладам таму служыць сітуацыя майго сябра і калегі, беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага, віцэ-прэзідэнта FIDH, арыштаванага 4 жніўня гэтага году, які ўсё яшчэ неабгрунтавана знаходзіцца пад вартай. Дыктатары трымаюцца адзін за аднаго, тое ж павінны рабіць і мы! Міжнародная супольнасьць павінна ня толькі выкарыстоўваць усе наяўныя сродкі па абароне правоў чалавека і дэмакратыі, але і ўзмацняць іх, рашуча і згуртавана. Што ж такое дыялог, калі ён не заснаваны на павазе правоў чалавека і ўсіх тых, хто абараняе іх, часта з рызыкай для ўласнага жыцьця? Алесь Бяляцкі павінен быць неадкладна вызвалены і атрымаць магчымасьць працягваць сваю мужную і легітымную працу, так патрэбную людзям яго краіны і ўсяго рэгіёну", – заявіла Шырын Эбадзі.



Шырын ЭБАДЗІ.

Падчас прэс-канферэнцыі, якая прайшла 5 кастрычніка ў Брусельскім офісе Міжнароднай Федэрацыі за правы чалавека (FIDH), Шырын Эбадзі, якая прыехала ў Брусель па запрашэньні кіраўніка Еўракамісіі Жазэ Мануэла Барозу, таксама згадала справу Бяляцкага, узяўшы ў рукі яго партрэт: "Хачу сказаць таксама з нагоды сітуацыі ў Беларусі. Гэта фатаграфія майго беларускага калегі Алеся Бяляцкага. У дадзены момант ён знаходзіцца ў турме", – заявіла Шырын Эбадзі. "Мяне вельмі засмуціла вестка пра тое, што дзьве дзяржавы сябры Еўрапейскага Зьвязу, Літва і Польшча, дапамаглі беларускім уладам арыштаваць Алеся Бяляцкага", – дадала яна.

Адна з самых вядомых у сьвеце дысідэнтаў, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 1991 году Аун Сан Су Чжы з Бірмы далучылася да міжнароднай кампаніі ў абарону перасьледаванага ўладамі Беларусі праваабаронцы, віцэ-прэзідэнта Міжнароднай Федэрацыі за правы чалавека Алеся Бяляцкага. Даведаўшыся пра сітуацыю з вядомым беларускім праваабаронцам, Аун Сан Су Чжы падтрымала яго, накіраваўшы ў менскае СІЗА паштоўку са словамі салідарнасьці:

*"Дарагі Алесь,*

*Спадзяюся ты зусім-зусім хутка выйдзеш на волю і апынешся сярод тваіх родных і сяброў, якіх у цябе вялікая колькасьць ва ўсім сьвеце.*

*З найлепшымі пажаданьнямі,*

*Аун Сан Су Чжы".*

## Алесь Бяляцкі ўзнагароджаны дыпломам "За мужнасьць і барацьбу за свабоду"

2 кастрычніка на ўрачыстай цырымоніі закрыцьця V Міжнароднага фестывалю праваабарончых фільмаў у Бішкеку старшыня ПЦ "Вясна" і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Федэрацыі за правы чалавека Алесь Бяляцкі ўзнагароджаны дыпломам "За мужнасьць і барацьбу за свабоду".

Узнагароду праваабаронцу, які па палітычна матываваных прычынах утрымліваецца пад вартай, арганізатары фестывалю перадалі праз сябру міжнароднага журы з Беларусі Паліну Сцепаненка.

У знак праваабарончай салідарнасьці ў кінатэатры "Манас" удзельнікам і гледачам фестывалю была прэзентаваная дакументальная стужка пра асобу і дзейнасьць гэтага выбітнага чалавека – "Сьвечка праўды Алеся Бяляцкага", сцэнарыстам якой зьяўляецца Паліна Сьцепаненка.

V Міжнародны фестываль дакументальных фільмаў па правах чалавека "Бир Дуйно Кыргызстан" праходзіў у Бішкеку з 27 верасьня па 2 кастрычніка. Арганізатарам выступіў праваабарончы цэнтр "Грамадзяне супраць карупцыі" пры падтрымцы міжнародных арганізацыяў. У праграме фестывалю дэманстраваліся 29 фільмаў з 16 краінаў сьвету па тэмах: "Герой нашага часу / Кіргізскі вобраз міру", "Улада, грамадзтва, закон, карупцыя", "Правы дзяцей і моладзі", "Правы чалавека ў перыяд папярэдняга заключэньня пад варту", "Выратуй і захавай", "Правы жанчын".

## Віцэ-прэзідэнт Бундэстагу прымае апеку над Алесем Бяляцкім

**Катрын Герынг-Экард, віцэ-прэзідэнт Бундэстагу Германіі, афіцыйна ўзяла апеку над Алесем Бяляцкім.**

**"Як і беларускія, а таксама міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, я мяркую, што яго ўтрыманьне пад вартай зьяўляецца палітычна матываваным і мае намер перашкодзіць яго законнай дзейнасьці ў якасьці праваабаронцы. Вось ужо больш за два месяцы Алесь Бяляцкі знаходзіцца ў вязьніцы, а ў цяперашні час яму не дазваляецца пісаць і атрымліваць лісты. Таму я лічу Алеся Бяляцкага вязьнем сумленьня прэзідэнта Лукашэнкі і заклікаю да яго неадкладнага і безумоўнага вызваленьня і гарантаванай бясьпекі ягонаму жыцьцю і фізічнаму стану", – заявіла Катрын Герынг-Экард.**

# Алесь Бяляцкі: Партрэт на фоне кратаў

***"Спачатку яны цябе не заўважаюць. Пасьля сьмяюцца з цябе. Пасьля змагаюцца з табою. А пасьля ты перамагаеш". Гэта вядомы выраз Махатмы Гандзі. Ён апісвае шлях кожнага, хто разумее, што ўласная годнасьць ня зьдзейсьненая, пакуль прыніжаецца годнасьць іншых. Ствараючы партрэт Алеся Бяляцкага, я іду ўсьлед за словамі гэтага важнага для мяне чалавека. Побач з ягонай выявай я хацела б разьмясьціць і свой малюнак.***

Мы размаўлялі з Алесем Бяляцкім для праграмы "Бацькі і дзеці незалежнасьці" за месяц да ягонага арышту. Часу было крытычна мала, каб апісаць апошнія 30 гадоў. Але ў Бяляцкага ёсьць выдатная здольнасьць: у кожнай асобнай дэталі ён бачыць усю карціну цалкам; за кожнай датай і падзеяй – тыя рухаючыя сілы, якія мяняюць гістарычныя эпохі і сьвядомасьць людзей.

Праз уласную біяграфію ён здолеў у некалькі штрыхоў стварыць пераканаўчую панараму таго, што, чаму і як адбывалася і адбываецца з намі. Напэўна, гэта было ня так і складана, бо ў большасьці з падзеяў ён удзельнічаў асабіста. Але захапляла абсалютна бліскучая інтэлектуальная разьняволенасьць, з якой ён аперaваў складанымі сацыяльна-палітычнымі феноменамі, спалучаў факты, тут жа іх аналізаваў і прыходзіў да нестандартных высноваў. Дзякуючы Бяляцкаму адасобленыя паміж сабою падзеі ўтварылі для мяне пасьлядоўную повязь, змацаваную руплівай працай, верай і адданасьцю іх удзельнікаў, у тым ліку і Алеся Бяляцкага.

– Немагчыма, каб на пустым полі адразу вырас добры ўраджай, – кажа Алесь Бяляцкі. – А тое, што пакінула на ім камуністычная ўлада пасьля 70 гадоў у Беларусі можна назваць такой выпаленай зямлёй... Былі часы ў канцы 80-х гадоў, калі мы літаральна ведалі адзін аднаго ў твар… А на пачатку 90-х гэта ўжо хутка зьмянілася – зьявіліся тысячы і дзясяткі тысячаў… Мы займелі ўстойлівую падтрымку ў грамадзтве. Фактычна шмат у чым летуценны рух, які абапіраўся толькі на нейкія аскалкі, што засталіся ад ранейшых традыцыяў палітычных, культурных, займеў вельмі цьвёрды грунт. Цяпер мы маем сваіх 25-30 адсоткаў падтрымкі... І менавіта тады яны высьветліліся, менавіта тады яны фармаваліся. І гэта ня мала. Гэта мільёны людзей, якія аднaзначна бачаць Беларусь іншай".

Гэтая характэрная ўпэўненасьць, якая ў 1981, відаць, была толькі асабістым унутраным поклічам, прымусіла звычайнага студэнта Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсітэту Алеся Бяляцкага загаварыць па-беларуску. Юначае захапленьне роднай літаратурай стала грамадзянскім учынкам. Ён быў адзін, і з яго сьмяяліся, але хутка перасталі. Калі ў 1984 годзе Бяляцкі скончаў унівэрсітэт, па-беларуску на філалягічным факультэце гаварылі ўжо некалькі дзясяткаў чалавек.

У пошуках аднадумцаў у 1982-м Алесь пазнаёміўся з менскімі Майстроўцамі – Вінцуком Вячоркам, Сяргеем Сокалавым-Воюшам, Сяргеем Запрудзкім, Алесем Сушам… Тагачасныя ўмовы яшчэ не дазвалялі маладым публічна заяўляць пра свае палітычныя перакананьні. Праз сумесныя сьпевы і паганскія карагоды майстроўцы гуртавалі вакол сябе людзей і такім чынам легалізавалі сваю дзейнасьць. Што, аднак, не пазбаўляла іх ад увагі КДБ. Але ўнутры гуртка існавала таемнае кола тых, хто ўжо тады ставіў перад сабою палітычныя задачы – стварэньне нацыянальнай дзяржавы, укараненьне прынцыпаў дэмакратыі і правоў чалавека. Паводле словаў Бяляцкага, першыя спробы гэтага пакаленьня сфармуляваць сваю палітычную пазіцыю адбыліся менавіта тады, а моладзевы рух разьвіваўся па адмыслова распрацаваным "плане".

– Мы прынялі пастанову разьбегчыся па няўрадавых арганізацыях і стварыць іх, – гаворыць Алесь Бяляцкі. – Гэта была рэальная пастанова і кожны мусіў там працаваць. І мы разьбегліся і стварылі.

У сьнежні 1986 Алесь Бяляцкі разам з сябрам яшчэ студэнцкіх часоў Анатолем Сысом заснавалі "Тутэйшых". Сітуацыя мянялася настолькі імкліва, што патрэба камуфляваць нацыянальнае адраджэньне культурніцкай актыўнасьцю зьнікла вельмі хутка. Праз два месяцы "тутэйшых" было ўжо 100 чалавек, а за наступны 1987-ы год сетка арганізацыі пакрыла ўсю Беларусь.

"Тутэйшыя" былі маленькай дзяржавай. Алеся Бяляцкага абралі старшынём, Анатоля Сыса – адказным за паэзію, Адаму Глобусу аддалі прозу, а іншыя роды літаратуры таксама займелі сваіх кіраўнікоў... З такім жа посьпехам яны маглі б падзяліць паміж сабою міністэрскія партфелі, пошту, тэлефон і тэлеграф. У праграмным Маніфэсьце "Тутэйшыя" супрацьпаставілі сваю свабодную творчасьць сэрвільнай прадукцыі савецкіх "майстроў слова". Гэта ўжо была палітычная заява: адмаўляючыся забясьпечваць патрэбы камуністычнай дзяржавы літаратары нібыта заяўлялі пра магчымасьць існаваньня дзяржавы іншай. Хаця Алесь кажа, што незалежнасьць тады ўяўлялася фантастыкай.

– Я тады ў сваім жыцьці ня думаў, што дажыву нават да таго часу, калі Беларусь будзе незалежнай... – кажа Алесь.

Пад кіраўніцтвам Бяляцкага "Тутэйшыя" хутка займелі лідарскі голас у тагачасным моладзевым руху. Яны бралі ўдзел у першых незалежных мітынгах ужо ў 1987 годзе. А ў сьнежні гэтага ж году на Першым вальным Сойме Канфедэрацыі беларускіх суполак, на які сабралася каля 100 моладзевых арганізацыяў, зьніцыявалі стварэньне аб'яднаньня беларускай моладзі. Прынятая на сойме праграма палітычных пераўтварэньняў лягла ў аснову будучай праграмы БНФ.

У адзін дзень 19 кастрычніка 1988 году Бяляцкі стаў сузаснавальнікам першай праваабарончай арганізацыі "Мартыралог Беларусі" і сябрам арганізацыйнага камітэту БНФ. Яму было 26 гадоў.

– Моладзевыя суполкі сталі касьцяком БНФ, – гаворыць Алесь Бяляцкі. – І праца па стварэньні палітычнай арганізацыі лягла фактычна на нашыя плечы – юнакоў і дзяўчат, якім было ад 20 да 27… Выйсьця не было, таму што структураванага старэйшага пакаленьня перад намі не было.

Літаральна праз пару тыдняў 30 кастрычніка 1988 году ў Менску адбылося легендарнае шэсьце Дзяды. Бяляцкага тады затрымалі як арганізатара і далі штраф у 200 савецкіх рублёў.

Бяляцкі апісвае канец 80-х як "сьмешны" час. Скончыўшы



Алесь БЯЛЯЦКІ на мітынгу Вольных прафсаюзаў, 1995 год.

асьпірантуру, не было нават размовы пра тое, каб абараняць дысертацыю, і ніводзін з абласных інстытутаў, куды разьмяркоўваліся былыя асьпіранты, не хацеў браць Бяляцкага на працу. Так ён аказаўся малодшым навуковым супрацоўнікам музею гісторыі беларускай літаратуры:

– Гэта як раз 1989-ы год, калі пайшла кампанія з Масквы, што будзем выбіраць усіх дырэктараў. Ну і абвясьцілі выбары дырэктара музея Багдановіча. Было чатыры кандыдаты. Выбіралі калектывы, прычым, і калектыў прагаласаваў за мяне. Я стаў дырэктарам. Усё проста."

10 гадоў працы ў музеі (з 1989 па 1998), можа, найбольш плённы час для Бяляцкага, калі асабістае жаданьне займацца літаратуразнаўствам і творчасьцю ідэальна спалучалася з грамадзка-палітычнымі мэтамі. І гэта працавала.

Музей трэба было будаваць "з нулю", з голых сьценаў – ва ўмовах татальнага дэфіцыту і непаразуменьня з уладай. Бяляцкаму гэта ўдалося. Да таго ж з 1992 па 1996 год ён быў дэпутатам Мінскага гарсавету, што дазваляла адстойваць грамадзкія інтарэсы на зусім іншым узроўні.

За першыя пяць гадоў існаваньня з аднаго музею ўзьнікла чатыры: "Беларуская хатка" на вуліцы Рабкораўскай у Менску, музей-сядзіба М. Багдановіча ў Ракуцёўшчыне, экспазіцыя ў Яраслаўлі і галоўны будынак музею М. Багдановіча ў Менску.

Музей стаў адным з цэнтраў грамадзянскай супольнасьці – у ім былі зарэгістраваныя бадай з 50 разнастайных недзяржаўных арганізацыяў. У хатцы на Рабкораўскай адбываліся першыя ўніяцкія набажэнствы, і засядала ўправа БНФ. Праводзіліся сотні мерапрыемстваў, кожны год выдаваліся кнігі. Паводле словаў Бяляцкага, жыцьцё і творчасьць Багдановіча дасьледаваліся на такім высокім навуковым узроўні, якога цяпер ня мае аніводзін іншы музей.

Гэты перыяд, калі можна было змагацца не "супраць", а "за", цягнуўся нядоўга. Алесь кажа, што мы пераацанілі рэвалюцыйны патэнцыял народу – ён хутка пачаўся і хутка скончыўся. Разьвітаньне з верай у непазьбежнасьць дэмакратычных пераменаў было найбольш балючым. Усё зробленае за папярэднія паўтара дзясяткі гадоў ламалася пад аднаго чалавека. Калі за 10 гадоў да таго грамадзтва патрабавала стварэньня "Тутэйшых" і БНФ, то ў 1996-м была неабходная арганізацыя, якая б дапамагала кожнаму канкрэтнаму чалавеку абараняць свае базавыя правы. Бяляцкі гэтую патрэбу адчуў хутчэй за іншых, памятаючы пра тое, як у 1988-м калегі сабралі грошы, каб аплаціць ягоны штраф. На хвалі рэпрэсіяў падчас масавых акцыяў увесну 1996 году ён заснаваў праваабарончую арганізацыю "Вясна".

Да 2003 году, калі арганізацыя была забароненая беларускімі ўладамі, яна пасьпела стварыць моцную агульнанацыянальную структуру. Нягледзячы на нелегальны статус ва ўласнай краіне – "Вясна" паўнавартасны сябра міжнароднай супольнасьці праваабарончых арганізацыяў. Ужо пасьля фактычнага закрыцьця "Вясна" стала сябрам Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека – FIDH, а Бяляцкі яе віцэ-прэзідэнтам.

Адшыхтаваная мадэль незалежнай структуры, ужо ня раз апрабаваная Бяляцкім, хутка адаптавалася да ўмоваў персаналісцкага рэжыму. Вясноўцы назіраюць за выбарамі, навучаюць правам чалавека, дапамагаюць канкрэтным людзям, змагаюцца супраць сьмяротнага пакараньня. Кіраўнік "Вясны" Алесь Бяляцкі прыходзіць у суды, раздае ўлёткі на вуліцах, стаіць у пікетах пры любым надвор'і і носіць цішотку "Не – сьмяротнаму пакараньню". Гэта і ёсьць ягоны спосаб працы.

У 2006 годзе Вацлаў Гавел уганараваў Алеся Бяляцкага прэміяй Homo Homini. У 2008 яе атрымаў кітайскі дысідэнт і будучы нобелеўскі лаўрэат Лі Сяобо. Алеся вылучылі на Нобелеўскую прэмію міру ў тым жа 2006 годзе.

А 3 кастрычніка 2011 году быў заснаваны аргкамітэт па вылучэньні Алеся Бяляцкага на Нобелеўскую прэмію міру 2012.

Алесь Бяляцкі жанаты з гомельскай талакоўкай Наталяй і мае 22-гадовага сына Адама. Наталя працуе выкладчыцай, а Адам скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў і атрымаў прафесію рэжысёра тэлебачаньня. Алесь з гонарам распавядаў пра тое, што сын удзельнічаў ва ўсіх акцыях маўклівага пратэсту і ў сеціве доўгі час блукала ягоная фотка з подпісам "Гэты хлопец першым спыніў машыну на прасьпекце". Калі Алесь ужо сядзеў у СІЗА, Адама затрымалі на адной з акцыяў "Стоп-бензін" і асудзілі да штрафу.

4 жніўня 2011 году Алеся Бяляцкага арыштавалі. Ён абвінавачаны ва ўтойваньні прыбыткаў у асабліва буйным памеры (ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэксу). Міністэрства юстыцыі Літвы і Генпракуратура Польшчы выдалі беларускім уладам інфармацыю пра рахункі Алеся Бяляцкага ў замежных банках. На гэтыя рахункі паступала фінансавая дапамога пацярпелым ад рэпрэсіяў. Алесь можа быць зьняволены на 7 гадоў.

Беларускія ўлады сьцьвярджаюць, што перасьледуюць Бяляцкага выключна на эканамічных, а не палітычных падставах. Фармальна яны маюць рацыю. Аднак, законы, якія нібыта парушыў Алесь, створаныя толькі для таго, каб групе людзей, якая, выглядае, узурпавала ўладу ў нашай краіне, было зручна распараджацца ёю ў сваіх інтарэсах. Такія законы ніяк не абараняюць усіх іншых грамадзянаў. І гэта цалкам пацьвярджаюць факты, якія зьбірае "Вясна" ў бюлетэні "Права на волю" і штогадовым Аглядзе-хроніцы парушэньняў правоў чалавека.

Алесь Бяляцкі прыняў рашэньне застацца ў Беларусі, ужо ведаючы, што трапіць у турму. Так ён сьцьвердзіў права кожнага беларускага грамадзяніна адстойваць свае правы ў сваёй краіне. Гэта абсалютна роўнае спаборніцтва аднаго чалавека і цэлай сістэмы.

І Алесь Бяляцкі перамог.

**Аляксандра Дынько,**
**Радыё Свабода.**

# Прысуд незаконны



Сьвятаслаў БАРАНОВІЧ.

У судзе Маскоўскага раёну Менску 28 верасьня і 12 кастрычніка пад старшынствам суддзі Алены Рудніцкай, з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы пракурора Пракуратуры Маскоўскага раёну Менску Сяркова адбыўся судовы разгляд крымінальнай справы Сьвятаслава Барановіча, які абвінавачваўся па ч. 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь (непасрэдны ўдзел у масавых беспарадках).

12 кастрычніка суд прызнаў абвінавачанага вінаватым ва ўчыненьні злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь, і прысудзіў да абмежаваньня волі на тры гады без накіраваньня ва ўстанову адкрытага тыпу. Суд ужыў у дачыненьні да Сьвятаслава Барановіча арт. 70 КК Рэспублікі Беларусь і палічыў магчымым вынесьці прысуд, меншы за мінімальную мяжу, прадугледжаную ч. 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь. Такая магчымасьць, на думку суда, зьвязаная з наяўнасьцю зьмякчальных акалічнасьцяў, а менавіта – маладога ўзросту Барановіча і наяўнасьці месца працы.

Праваабарончы цэнтр "Вясна", нягледзячы на тое, што прысуд падаецца мяккім, лічыць, што гэты прысуд не адпавядае фактычным матэрыялам справы, а таму зьяўляецца незаконным.

**1.** У судовым працэсе, як і ў папярэдніх, не прадстаўленыя неабходныя доказы таго, што 19 сьнежня 2010 г. падчас мірнай акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў мелі месца масавыя беспарадкі, прадугледжаныя арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь, а менавіта падпалы, пагромы, гвалт над асобай, зьнішчэньне маёмасьці, узброены супраціў прадстаўнікам праваахоўных органаў і органаў улады.

**2.** У судзе так і не былі прадстаўленыя дакладныя доказы таго, што абвінавачаны ўчыніў хоць адно з дзеяньняў, якія дыспазіцыяй артыкулу 293 КК Рэспублікі Беларусь аднесеныя да масавых беспарадкаў.

**3.** Шэраг судовых матэрыялаў, у першую чаргу відэаматэрыялаў, могуць быць непасрэдным доказам таго, што Барановіч учыніў іншыя правапарушэньні, якія могуць кваліфікавацца як дробнае хуліганства. Так, у выступе ў спрэчках дзяржаўны абвінаваўца ня даў ацэнку паказаньням шматлікіх пацярпелых, а менавіта Вадзіма Сміронава, Сяргея Масальскага, Сяргея Палая, Дзьмітрыя Шпака, якія засьведчылі, што не бачылі, каб сам абвінавачаны ці іншыя ўдзельнікі сходу наносілі ўдары, учынялі пагромы, падпалы, аказвалі ўзброены супраціў супрацоўнікам міліцыі. Адзінай падставай, на якую спаслаўся пракурор, стала тое, што ў аналагічных працэсах ужо знайшло сваё пацьверджаньне ўчыненьне 19 сьнежня 2010 г. у Менску масавых беспарадкаў. Такім чынам, ні дзяржаўны абвінаваўца, ні суд не далі ацэнку паказаньням пацярпелых, сьведчаньням сьведкаў і абвінавачанага, з якіх вынікала, што ў Менску ня мелі месца масавыя беспарадкі.

### Адсутнасьць самога факту масавых беспарадкаў

19 сьнежня 2010 г. у Менску акцыя пратэсту насіла мірны характар. Толькі невялікая група, ня больш за 20 чалавек, адхілілася ад мірнага характару акцыі і прыняла ўдзел у гвалтоўных дзеяньнях. Частка гэтых асобаў рабілі гэта з хуліганскіх меркаваньняў, але іх дзеяньні не суправаджаліся пагромамі, падпаламі, узброеным супрацівам, гвалтам над асобай.

Масавыя беспарадкі прадугледжваюць прамы намер на іх учыненьне, узгодненасьць у дзеяньнях асобаў, неўтаймаванасьць натоўпу. Сьведкі паказалі, што ў руках у дэманстрантаў не было бачна прадметаў, якія маглі б выкарыстоўвацца для гвалтоўных дзеяньняў (не было чаранкоў ад рыдлёвак, ледарубаў, рыдлёвак, сякер). Супрацьпраўныя дзеяньні былі спыненыя адразу, як толькі зьявіліся супрацоўнікі міліцыі, якія доўгі час дэманстратыўна не ўмешваліся ў дзеяньні правапарушальнікаў, ніякім чынам не спыняючы іх.

### Доказнасьць віны

Ніводны з сьведкаў альбо пацярпелых не паказаў, што бачыў, як абвінавачаны наносіў удары супрацоўнікам міліцыі ці па дзьвярах будынка. Сам абвінавачаны патлумачыў, што ён атрымаў удар па галаве дубінкай, быў у шокавым стане, сьцякаў крывёю і ў такім стане нанёс некалькі ўдараў гумавай дубінкай, якую выцягнуў з вакна Дому Ураду, па шчытах супрацоўнікаў міліцыі, не імкнучыся патрапіць па іх ці нанесьці ім шкоду.

### Выснова

Асуджэньне абвінавачанага Сьвятаслава Барановіча па ч. 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь зьяўляецца незаконным і палітычна матываваным.

# Дзьмітры Ус на волі

Увечары 1 кастрычніка з Магілёўскай калоніі №15 вызвалены Дзьмітры Ус, асуджаны да пяці з паловай гадоў зьняволеньня за арганізацыю "масавых беспарадкаў" 19 сьнежня 2010 году ў Менску. Ён вызвалены паводле ўказу Лукашэнкі аб памілаваньні. Прашэньня аб памілаваньні не пісаў, хоць яму некалькі разоў прапаноўвалі. Найцяжэйшым часам у няволі Ус назваў першыя дні пасьля арышту. У калоніі ён сядзеў пераважна з асуджанымі за фінансавыя злачынствы і за наркотыкі. Дзьмітры Ус заявіў, што ў наступным годзе абавязкова возьме ўдзел у выбарах у парламент. Сказаў, што будзе паранейшаму патрабаваць зьмены выбарчага закону. Калі выбары будуць сапраўды дэмакратычнымі, ён не сумняецца, што яго выберуць у парламент.



Дзьмітры УС.

За кратамі працягваюць заставацца экс-кандыдаты ў прэзідэнты Андрэй Саньнікаў і Мікола Статкевіч.

# "Не – сьмяротнаму пакараньню!"

10 кастрычніка, у Сусьветны дзень барацьбы супраць сьмяротнага пакараньня, праваабаронцы, грамадзкія актывісты і маладыя валанцёры ў сталіцы і рэгіёнах краіны правялі акцыю супраць выкарыстаньня ў Беларусі сьмяротнай кары.

У Менску актывісты кампаніі "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня" выйшлі на праспект Незалежнасьці, каб нагадаць мінакам, што ў Беларусі дагэтуль дзяржава забівае людзей. Інфармацыйныя буклеты, паводле словаў праваабаронцаў, людзі бралі зацікаўлена, і было шмат нераўнадушных да гэтай праблемы грамадзянаў, з некаторымі нават атрымалася падыскутаваць.


Менск, 10 кастрычніка 2011 году.


Менск, 10 кастрычніка 2011 году.

Буклеты "Не – сьмяротнаму пакараньню!" праваабаронцы і грамадзкія актывісты распаўсюджвалі ў той дзень у Баранавічах, такім чынам далучыўшыся да агульнарэспубліканскай кампаніі "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня". Мерапрыемства адбывалася ў цэнтры гораду: ля крамаў, прыпынкаў, у маладым парку па вуліцы Камсамольскай, дзе заўсёды шмат мінакоў. І моладзь, і людзі старэйшага ўзросту ахвотна бралі інфармацыйныя матэрыялы і ўступалі ў дыскусію з праваабаронцамі наконт "забойства злачынцаў". Падчас гэтых дыскусіяў арганізатары акцыі высьветлілі, што каля паловы апытаных грамадзянаў адмоўна ставяцца да гэтага віду пакараньня і лічаць, што Беларусі трэба ўводзіць мараторый на сьмяротную кару.

# Гэта прыніжэньне чалавечай годнасьці

*"Сьмерць кожнага Чалавека прыніжае і мяне, бо я адзіны з усім чалавецтвам ..."*
***Джон Дон, ангельскі паэт XVI ст.***

Кожны з нас памятае пачуцьцё трывогі і дыскамфорту, якое ўзьнікае пры выглядзе таго, як абражаюць і зьневажаюць іншага чалавека. Гэта пачуцьцё, хутчэй за ўсё, выкліканае відавочным парушэньнем няпісанага пагадненьня аб узаемнай павазе паміж людзьмі. Мусіць, нішто не кідае такога сур'ёзнага выкліку чалавечай годнасьці, як вынесенае судом рашэньне аб забойстве. Натуральна, у большасьці краінаў, якія практыкуюць сьмяротнае пакараньне, такія прысуды выносяцца якраз людзям, што праявілі непавагу да сьвятасьці чалавечага жыцьця. Але ці можна аплаціць жыцьцё пазбаўленьнем жыцьця?

Сьмяротнае пакараньне – вельмі эмацыйная тэма. І тыя, хто падзяляючы пазіцыю Еўрапейскага зьвязу лічыць, што яно зьневажае неаддзельную і неад'емную годнасьць кожнага чалавека, уваходзіць у складаную сферу філасофіі. Але той факт, што ўсё больш і больш краінаў у сьвеце адмяняюць сьмяротную кару, кажа ў падтрымку гэтага аргументу. Адносна нядаўна, у 1977 годзе, ад яе адмовіліся 16 краінаў. З 58 краінаў, якія захавалі сьмяротную кару ў заканадаўстве, менш за палову ўжываюць яе на практыцы. У Еўропе толькі Беларусь працягвае ўжываць сьмяротнае пакараньне.

Тыя, хто выступае ў абарону сьмяротнага пакараньня, кажуць пра тое, што яно служыць "натуральнаму правасуддзю" і прыносіць неабходнае заспакаеньне родным ахвяраў злачынстваў. Аднак далёка ня ўсе родныя ахвяраў лічаць, што гора і гнеў, якія яны адчуваюць, становяцца слабей пасьля пакараньня сьмерцю злачынцы. Некаторыя, наадварот, лічаць, што гвалт толькі спараджае новы гвалт, і гэтая спіраль закручвае і вінаватых, і невінаватых. Яскравым сьведчаньнем гэтага служыць прыклад Рут Эліс, апошняй жанчыны, асуджанай да сьмяротнага пакараньня ў 1955 годзе ў Вялікабрытаніі за забойства свайго палюбоўніка. Яна заплаціла сваім жыцьцём за жыцьцё, якое яна адабрала. Але гвалт на гэтым не спыніўся. Яе муж і сын учынілі самагубствы, а многія ўдзельнікі судовага працэсу да канца жыцьця не акрыялі ад здарэньня.

Амерыканскі вучоны Дэвід Гарланд дасьледаваў уплыў сьмяротнага пакараньня на судзьдзяў, уцягнутых у вынясеньне сьмяротнага прысуду, а таксама на тых, хто прыводзіць прысуд у выкананьне. Ён мяркуе, што яны трапляюць у сітуацыю "культурнай супярэчнасьці, у якой ад іх чакаецца адначасова паслушэнства закону і парушэньне закону, з прычыны чаго яны апынаюцца ў нязручнай прасторы паміж культурнымі нормамі ліберальнага гуманізму і прававой практыкай пакараньня злачынцаў".

Пакараньне сьмерцю Рут Эліс у 1955 годзе абвастрыла ў брытанскім грамадстве дыскусію аб тым, як санкцыянаванае дзяржавай забойства можа ўзгадняцца з абавязкам дзяржавы абараняць годнасьць сваіх грамадзянаў. Пяцьдзясят тысячаў чалавек падпісалі петыцыю аб памілаваньні Рут. У дзень яе кары адна з буйных брытанскіх газет асудзіла тое, што адбылося, такімі словамі: "толькі адна якасьць надае годнасьці чалавечаму роду і ўзвышае нас над жывёламі. І менавіта ў гэтым мы адмовілі ёй – у літасьці і надзеі на выратаваньне".

# "Ашуканцаў да адказу"

## Міліцыя разагнала пікет, які спрабавалі зладзіць маці асуджаных



Менск, 3 кастрычніка 2011 году.

Два дзясяткі чалавек выйшлі 3 кастрычніка на плошчу Свабоды ў Менску з плакатамі: "Чыноўнікаў да адказнасьці", "Адміністрацыя прэзідэнта – надзейны абаронца ад беззаконьня ў краіне", "Ашуканцаў да адказу". Удзельнікі акцыі лічаць, што іхніх сваякоў асудзілі незаконна.

8 верасьня група грамадзянаў падала заяўку ў Менгарвыканкам на пікет.

Кіраўніца акцыі Тамара Сяргей кажа, што да ідэі правесьці акцыю ўдзельнікі грамадзянскай ініцыятывы прыйшлі пасьля таго, як 5 верасьня іх у чарговы раз адмовіўся прыняць старшыня Вярхоўнага суда Валянцін Сукала.

"10 сьнежня кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей паабяцаў нам стварыць незалежную камісію па вывучэньні праблемы адпісак з органаў суда і пракуратуры на скаргі грамадзянаў. Мы спадзяваліся, што праца камісіі прывядзе да перагляду нашых справаў. Аднак да гэтага часу мы ня можам азнаёміцца з вынікамі працы гэтай камісіі, бо чыноўнікі спасылаюцца на тое, што матэрыялы яе дзейнасьці складаюць службовую перапіску. Пры гэтым большасьць справаў удзельнікаў ініцыятывы так і не былі перагледжаныя, а старшыня Вярхоўнага суда і генпракурор адмаўляюць нам у прыёме", – распавяла спн. Сяргей журналістам.

Тамара Сяргей заявіла, што ўдзельнікі акцыі будуць прыходзіць на плошчу Свабоды штодня цягам месяца.




Сьпецназаўцы ў форме і ў цывільным разагналі акцыю. Шэсьць чалавек закінулі ў аўтобус і адвезьлі ў міліцыю. Жанчыны, якія засталіся на волі, распавялі, што міліцыянеры іх абражалі і нецэнзурна лаяліся.

У міліцыі высьветлілі асобы затрыманых. Вядомыя прозьвішчы пяці чалавек. Гэта Тамара Сяргей, Валянціна Каваленка, Аляксандр Каваленка, Любоў Санкевіч, Марына Мельнік, Аляксандр Сафонаў. Сярод затрыманых жанчына, якая прыехала на пікет з Віцебску.

# "Ніякага чэмпіянату сьвету па хакеі ў Беларусі!"

Дэпутатка Бундэстагу Марылуіза Бэк адрэагавала на апошнія зьмены ў беларускім заканадаўстве. "Ніякага чэмпіянату сьвету па хакеі ў Беларусі!" – з гэткімі словамі зьвярнулася яна да Міжнароднай федэрацыі па хакеі з шайбай (IIHF). Падставай для заявы сталі апошнія зьмены ў беларускім заканадаўстве, "мэта якіх – уціск грамадзянскай супольнасьці і апазіцыі".

"Прынятыя кішэнным парламентам у рэжыме сакрэтнасьці папраўкі аб палітычных партыях і грамадзкіх аб'яднаньнях, а таксама прапанаваныя папраўкі аб КДБ нарэшце паказваюць сапраўдны твар дыктатара Лукашэнкі, – гаворыцца ў заяве. – У Беларусі і дагэтуль назіраўся перасьлед пратэстаў грамадзкасьці ды ціск на грамадзянскую супольнасьць, у КДБ ужываліся катаваньні супраць дысідэнтаў, у краіне зьнікалі апаненты рэжыму. Цяпер жа парушэньні дэмакратыі і правоў чалавека легітымізаваныя.

Беларусь, такім чынам, разьвіталася з міжнароднай супольнасьцю. Дыктатар Лукашэнка даў зразумець, наколькі ён у часы сур'ёзнага эканамічнага крызісу баіцца магчымых пратэстаў насельніцтва.

Краіна, якая адкрыта топча нагамі дэмакратыю і правы чалавека, ня можа быць гаспадыняй чэмпіянату сьвету па хакеі ў 2014 годзе. Мы заклікаем Міжнародную федэрацыю хакею, каб гэтае сусьветнае першынство не праходзіла ў Беларусі".

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.